Паважаныя калегі!

Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ініцыіруе правядзенне **Instagram-фестывалю “Народны каляндар”**.

Запрашаем прыняць удзел у Instagram-фестывалі “Народны каляндар”, які будзе адбывацца на працягу 2021 года ў сацыяльнай сетцы Instagram.

Instagram-фестываль “Народны каляндар” праводзіцца ў межах рэалізацыі

рэспубліканскага інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі сеткавай арганізацыі дзейнасці суб’ектаў рэспубліканскага метадычнага кластара як умова фарміравання інавацыйнага адукацыйнага асяроддзя дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”;

рэспубліканскага культурна-адукацыйнага праекта “Беларускае народнае мастацтва і дзеці”;

у рамках дзейнасці рэспубліканскага метадычнага аб’яднання педагагічных работнікаў народнай музычнай творчасці і фальклору.

**АРГАНІЗАТАРЫ:**

Установа адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (аддзел навукова-метадычнага і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дадатковай адукацыі).

**МЭТЫ І ЗАДАЧЫ:**

рэпрэзентацыя і папулярызацыя рэгіянальных каляндарна-абрадавых традыцый праз выкарыстанне сучасных сродкаў анлайн-камунікацыі;

падтрымка творчай ініцыятывы і актыўнасці педагагічных работнікаў, развіццё фальклорнага руху ў інтэрнэт-прасторы;

развіццё медыякультуры як кампанента сучаснай адукацыйнай прасторы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

**УДЗЕЛЬНІКІ:** педагагічныя работнікі і творчыя калектывы ўстаноў адукацыі.

**ФАРМАТ І ТЭРМІН ПРАВЯДЗЕННЯ**

Instagram-фестываль “Народны каляндар” **праводзіцца ў сацыяльнай сетцы Instagram** і ўключае ***творчыя каляндарныя акцыі:***

Калядны флэшмоб **#заспявайкалядку** (*адбыўся ў студзені 2021 г.).

Веснавы лонгмоб **#вясна_красна** (сакавік, красавік, май 2021 г.).

Летні лонгмоб **#лета_лецейка** (чэрвень, ліпень, жнівень 2021 г.).

Восеньскі лонгмоб **#шчодраявосень** (верасень, кастрычнік, лістапад 2021 г.).

**ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І УМОВЫ УДЗЕЛУ**

Для ўдзелу ў Instagram-фестывалі “Народны каляндар” неабходна:

– ***падпісацца на старонку акаўнта methodnchtdm*** у сацыяльнай сетцы Instagram;

– ***выканаць фрагмент музычнай фальклорна-абрадавай дзеі*** адпаведна пэўнай творчай каляндарнай акцыі (лонгмобу) і мастацкіх традыцый свайго рэгіёна, ***падзяліцца відэа*** ў Instagram;

– у публікацыі пад відэапостам ***дадаць хэштэгі*** адпаведна каляндарнага лонгмоба і ***пазначыць дадзеныя ўдзельнікаў*** (назва творчага калектыву, установа адукацыі, прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву (цалкам));

– ***адзначыць акаўнты*** @methodnchtdm @nchtdm

| | |
|---|---|
| **ЗІМА – калядны флэшмоб #заспявайкалядку** (*адбыўся ў студзені 2021 г.).<br>Прэзентуюцца абрады і музычны фальклор свята “Каляды” ў адпаведнасці з асаблівасцямі рэгіянальных мастацкіх традыцый.<br>Удзельнікам флэшмоба прапануецца выканаць калядную песню, фрагмент фальклорна-абрадавай дзеі свята “Каляды”, падзяліцца відэа ў Instagram і пазначыць хэштэгі **#заспявайкалядку #каляды2021 #methodnchtdm #традыцыйнаякультура** |  |
| **ВЯСНА – веснавы лонгмоб #вясна_красна**<br>(сакавік, красавік, май 2021 г.).<br>Прэзентуюцца абрады і музычны фальклор веснавога цыкла ў адпаведнасці з асаблівасцямі рэгіянальных мастацкіх традыцый.<br>Удзельнікам лонгмоба прапануецца выканаць фрагмент музычнай фальклорна-абрадавай дзеі веснавога каляндарнага цыкла, падзяліцца відэа ў Instagram і пазначыць хэштэгі:<br>**#вясна_красна #народныкаляндар #methodnchtdm #традыцыйнаякультура** |  |

| | |
|---|---|
| **ЛЕТА** – летні лонгмоб **#лета_лецейка** (чэрвень, ліпень, жнівень 2021 г.).<br>Прэзентуюцца абрады і музычны фальклор летняга цыкла ў адпаведнасці з асаблівасцямі рэгіянальных мастацкіх традыцый.<br>Удзельнікам лонгмоба прапануецца выканаць фрагмент музычнай фальклорна-абрадавай дзеі летняга каляндарнага цыкла, падзяліцца відэа ў Instagram і пазначыць хэштэгі:<br>**#лета_лецейка #народныкаляндар #methodnchtdm #традыцыйнаякультура** |  |
| **ВОСЕНЬ**<br>Восеньскі лонгмоб **#шчодраявосень** (верасень, кастрычнік, лістапад 2021 г.).<br>Прэзентуюцца святы і абрады, музычны фальклор восеньскага цыкла ў адпаведнасці з асаблівасцямі рэгіянальных мастацкіх традыцый.<br>Удзельнікам лонгмоба прапануецца выканаць фрагмент музычнай фальклорна-абрадавай дзеі восеньскага каляндарнага цыкла, падзяліцца відэа ў Instagram і пазначыць хэштэгі:<br>**#шчодраявосень #народныкаляндар #methodnchtdm #нцхтдм #традыцыйнаякультура** |  |

**ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ**

Удзельнікі творчых лонгмобаў атрымліваюць электронныя сертыфікаты Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі адпаведна каляндарнаму лонгмобу кожнай пары года.

Найбольш актыўныя ўдзельнікі **Instagram-фестывалю “Народны каляндар”**, якія прынялі ўдзел у лонгмобах кожнай пары года, атрымаюць дыпломы Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі.

**КАНТАКТЫ:** 8-017-379-56-61 (Бондарава Святлана Аляксандраўна, Крыўко Таццяна Міхайлаўна, аддзел навукова-метадычнага і псіхолага-педагагічнага суправаджэння дадатковай адукацыі).

**Гласарый*

*Флэшмоб (ад англійскага flash – маланка альбо ўспышка, і mob – натоўп) – гэта спланаваная акцыя з выпадкова падабранымі ўдзельнікамі, калі мноства людзей у пэўны перыяд часу робяць адно і тое ж.*

*Лонгмоб – гэта доўгатэрміновая акцыя, загадзя абумоўленыя ў інтэрнэце дзеянні, якія кожны ўдзельнік можа здзяйсняць практычна ў любы зручны для яго час і ў зручным месцы.*